ДАРОГАМІ ПЕРАМОГІ

# «Добре дошли наши освободители»

**Такімі словамі ў верасні 1944 года сустракалі Чырвоную Армію жыхары Балгарыі. У перакладзе з балгарскай мовы значыць: «Сардэчна запрашаем, нашы вызваліцелі».**

Вызваленне Балгарыі войскамі 3-га Украінскага фронту пад камандаваннем генерала Фёдара Талбухіна пачалося 8 верасня 1944 г. Той падзеі папярэднічала нота савецкага ўрада ад 5 верасня 1944 г., якой СССР абвяшчаў вайну Балгарыі.

Балгарыя – адзіная краіна-саюзнік фашысцкай Германіі, чыя армія не ўдзельнічала ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Савецкага Саюза. Між тым прагерманскі ўрад Балгарыі ў лютым 1941 г. падпісаў пратакол аб размяшчэнні нямецкіх войскаў на тэрыторыі краіны, а 13 снежня 1941 г. абвясціў вайну ЗША і Вялікабрытаніі.

Балгарскі народ не падтрымаў свой урад, і летам 1942 г. быў створаны Айчынны фронт-кааліцыя антыфашысцкіх сіл. Галоўнай сваёй задачай ён лічыў разрыў саюзу з фашысцкай Германіяй і ўсталяванне дружбы і супрацоўніцтва з СССР і іншымі народамі, якія змагаліся з фашызмам.

У жніўні 1944 г. пасля разгрому Чырвонай Арміяй нямецкіх войскаў падчас Яска-Кішынёўскай наступальнай аперацыі камандаванне вермахта вырашыла, што абараняць Балгарыю немэтазгодна. Аднак гітлераўцы (каля 30 тысяч салдат і афіцэраў) бесперашкодна перамяшчаліся па гэтай краіне, рыхтаваліся да эвакуацыі, тапілі свае караблі, знішчалі ваенную тэхніку. Зразумела, такое становішча не магло задаволіць савецкі ўрад.

У той момант, калі савецкія часці ўжо набліжаліся з баямі да румынска-балгарскай мяжы, у Балгарыі стартавала чарада пераваротаў, змянілася некалькі ўрадаў. Апошні з іх, каб не дапусціць на тэрыторыю краіны Чырвоную Армію, 26 жніўня 1944 г. абвясціў аб поўным нейтралітэце Балгарыі і запатрабаваў ад Германіі вывесці свае войскі. Аднак часці вермахта працягвалі гэтак жа свабодна перамяшчацца па Балгарыі, як і раней.

5 верасня 1944 г. урад СССР у згаданай ужо ноце заявіў, што парывае ўсякія адносіны з Балгарыяй, што не толькі Балгарыя знаходзіцца ў стане вайны з СССР, але і Савецкі Саюз з гэтага часу будзе знаходзіцца ў стане вайны з Балгарыяй.

Балгарскія патрыёты з нецярпеннем чакалі дня, калі Чырвоная Армія ступіць на іх зямлю, каб сумесна дабіцца для сваёй радзімы сапраўднай незалежнасці. «Мы чакаем вас, браты-чырвонаармейцы, – гаварылася ў звароце галоўнага штаба Народна-вызваленчай паўстанцкай арміі да савецкіх войскаў. – Ваша блізкасць і наша воля да барацьбы з прыгнятальнікамі народа з'яўляюцца гарантыяй таго, што Балгарыя будзе вольнай, незалежнай і дэмакратычнай. Няхай жыве Чырвоная Армія!»

Перадавыя атрады 8 верасня ў 11.00, а праз паўтары гадзіны і асноўныя сілы войскаў 3-га Украінскага фронту перайшлі румынска-балгарскую мяжу. У загадзе Ваеннага савета гэтага фронту савецкім байцам прадпісвалася «імклівым ударам разграміць сустрэчнага ворага, знішчыць гітлераўскіх захопнікаў у Балгарыі і вызваліць роднасны нам балгарскі народ ад нямецка-фашысцкага іга».

Не мінула і паўгадзіны, як у штаб фронту пачалі паступаць паведамленні аб радаснай сустрэчы савецкіх войскаў балгарскім народам. Па звестках палітаддзела 37-й арміі, у паласе яе руху 8 верасня адбылося 27 масавых мітынгаў насельніцтва, на якіх людзі радасна віталі чырвонаармейцаў. На тых мітынгах прысутнічала больш за 80 тысяч чалавек! Газета «Айчынны фронт» пісала ў тыя дні, што «шлях Чырвонай Арміі ў глыб краіны і да яе сталіцы высланы кветкамі».

Пры гэтым руху савецкіх войск мітынгі не перашкаджалі. Ужо ў першы дзень войскі фронту прасунуліся на 70 кіламетраў у глыб тэрыторыі Балгарыі і выйшлі на рубеж Русе, Варна.



**Сцяпан Пятровіч ХОЛАД.**



**Георгій Аляксандравіч ПЛЫШЭЎСКІ.**



**Якаў Міхайлавіч МАКАВЕЦ.**



**Сямён Пятровіч МАХУНОЎ.**

**Калі стала зразумелым, што балгарская армія не акажа супраціўлення, Вярхоўны Галоўнакамандуючы Іосіф Сталін загадаў балгарскія войскі не раззбройваць.**

9 верасня ў выніку перамогі антыфашысцкага паўстання ў Сафіі да ўлады прыйшоў урад Айчыннага фронту, які заявіў аб разрыве адносін з Германіяй, а 10 верасня абвясціў аб стварэнні Балгарскай Народнай арміі, у склад якой былі ўключаны салдаты і афіцэры балгарскай арміі і байцы партызанскіх атрадаў. Сумесна з чырвонаармейцамі байцы Балгарскай Народнай арміі выгналі гітлераўскія войскі з тэрыторыі Балгарыі, і па стане на 28 верасня фронт усталяваўся па лініі балгарска-югаслаўскай дзяржаўнай мяжы.




**Насельніцтва Балгарыі радасна вітала чырвонаармейцаў.**

Сярод савецкіх узнагарод за вызваленне сталіц еўрапейскіх дзяржаў няма медаля за вызваленне Сафіі. Але падчас працы над праектам «Любанскі бессмяротны полк» удалося ўстанавіць імёны нашых землякоў-удзельнікаў вызвалення Балгарыі. Гэта, напрыклад, старшы сяржант адміністрацыйнай службы Іван Ленскі з в. Асавец, узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» і ордэнам Чырвонай Зоркі.

У складзе 37-й арміі падчас балгарскай аперацыі ваяваў **Сцяпан Холад** з в. Жораўка, які з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі – удзельнік абарончых баёў на Заходнім фронце, абароны Сталінграда, вызвалення Украіны, Малдовы, Румыніі. У 1943 г. узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, а 16 верасня 1944 г. гв. лейтэнант С.П. Холад, камандзір узвода боезабеспячэння 46-й гарматна-артылерыйскай брыгады, прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі.

**Георгій Плышэўскі** з в. Татарка ў 1942 г. прымаў удзел у баях на Заходнім і Паўднёва-Заходнім франтах. Пры фарсіраванні Дняпра ў лістападзе 1943 г. узнагароджаны медалём «За адвагу», а 12 верасня 1944 г. гв. яфрэйтар Г.А. Плышэўскі, тэлефаніст узвода кіравання камандуючага артылерыяй 20-й стралковай дывізіі 37-й арміі, прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Славы III ступені.

Старшы лейтэнант **Якаў Макавец** з в. Пясчанец пасля цяжкага ранення пад Сталінградам вярнуўся ў строй і атрымаў прызначэнне на пасаду намесніка па страявой частцы асобнага вучэбнага батальёна, які нараўне з іншымі падраздзяленнямі 28-й гвардзейскай стралковай дывізіі ўдзельнічаў у баях на тэрыторыі Румыніі і ў вызваленні Балгарыі. Загадам Ваеннага Савета 37-й арміі ад 28 верасня 1944 г. Я.М. Макавец узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Балгарская вызваленчая аперацыя завяршылася 28 верасня 1944 г. Паводле сучасных ацэнак пры вызваленні Балгарыі загінула 977 салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, паранена 11 773 чалавекі.

**Аб самаахвяраванні савецкіх салдат дзеля свабоды брацкага славянскага народа, аб іх подзвігах заклікае памятаць «Алёша», 11-метровы абеліск на 6-метровым пастаменце, які ўзвышаецца над горадам Плоўдзівам (другі па велічыне горад у Балгарыі).**

Сёлета ўлады горада чарговы раз прапанавалі знесці помнік. Падчас акцыі пратэсту працоўнікі зносу абвінавацілі дыппрадстаўніка ЗША ў гэтай ініцыятыве і назвалі яе вядзеннем вайны ЗША супраць Расіі на балгарскай тэрыторыі.

Сотні тысяч балгарскіх салдат і афіцэраў, якія пасля вызвалення сваёй краіны прынялі ўдзел у баявых дзеяннях супраць Германіі на тэрыторыі Югаславіі, Венгрыі і Аўстрыі, былі ўзнагароджаны савецкімі ордэнамі і медалямі, 750 савецкіх салдат і афіцэраў удастоены вышэйшых балгарскіх узнагарод. 96 тысяч узнагароджаны медалём «Айчынная вайна 1944–1945 гадоў».

Адзін з іх захоўваецца ў фондах Любанскага музея народнай славы. Пасведчанне да яго выпісана на імя **Сямёна Махунова**, узнагароджанага ад імя ўрада Балгарскай Народнай Рэспублікі «за ўдзел у Айчыннай вайне 1944–1945 г.». Пасля Перамогі мужчына працаваў на Любаншчыне.

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**